*Не буду плакаць, бедаваць,*
*Слязамі мора наліваць.*
*Слязамі мора не нальеш,*
*А толькі серца надарвеш*

(запісана ад Рудабелец Таццяны Васільеўны, 1957 г. н.).

Дыялогі і маналогі – яшчэ адна шырока распаўсюджаная з'ява ў частушках Барагіншчыны. Менавіта яны набліжаюць мову прыпеўкі да гутарковай:

*Ой, чаму ў цябе, дзяўчына,*
*Вусны сладзенькі?*
*Пакрапіла маці мёдам*
*Для цябе, міленькі*

(запісана ад Шкурко Ганны Адамаўны, 1926 г. н.).

Частушкі маюць выразную рыфму, якая надае радкам зладжанасць, садзейнічае больш глыбокаму сэнсаваму выяўленню. Рыфма адыгрывае вялікую ролю менавіта ў рытмічнай арганізацыі прыпеўкі. Па словах Я. Ф. Карскага, рыфма «звычайна аб'ядноўвае ў адзінае цэлае рытмічны перыяд, замыкаючы кожную з яго частак» [2, с. 28].

Такім чынам, варта адзначыць, што ў прыпеўках Брагіншчыны, у якіх распрацоўваюцца агульнабеларускія тэмы, мае месца і мясцовы каларыт, які выяўляецца ў тэматыцы, вобразах, сродках мастацкай выразнасці.

**Літаратура**

1 Цішчанка І. К. Беларуская частушка: пытанні генезісу жанру / І. К. Цішчанка. – Мінск : «Навука і тэхніка», 1971. – 168 с.

2 Прыпеўкі / уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. І. К. Цішчанкі; муз. частка Л. М. Фёдарава; рэдкал.: А. С. Фядосік і інш. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 432 с.

**УДК 821.161.3-3**

***Р. А. Прахарэнка***

## ТРАГЕДЫЯ ЧАРНОБЫЛЯ Ў ТВОРАХ Ю. СТАНКЕВІЧА І І. ПТАШНІКАВА

*У артыкуле прааналізаваны апавяданне Ю. Станкевіча «Уначы гучней бруяць фантаны», раман «Любіць ноч – права пацукоў» і апавяданне І. Пташнікава «Львы», на прыкладзе якіх асэнсавана Чарнобыльская трагедыя і яе ўплыў на лёсы тых, хто жыў або працаваў у непасрэднай блізкасці ад месца аварыі. Сцвярджаецца, што ў творах даводзіцца пра негатыўны ўплыў радыяцыі на фізічны і псіхічны стан чалавека. Паказваецца трагічнасць лёсу герояў, што пацярпелі ад дадзенай катастрофы.*

Аварыя на Чарнобыльскай АЭС стала для Беларусі сапраўднай нацыянальнай трагедыяй. Гэтая трагедыя моцна сказалася на жыцці людзей з усяго былога Савецкага Саюза. Сёлета спаўняецца роўна 35 год з моманту аварыі. Але па сённяшні дзень мы працягваем асэнсоўваць наступствы гэтай катастрофы. Нават сёння даследуецца ўплыў радыяцыі на чалавека. А многія пісьменнікі звяртаюцца да асэнсавання Чарнобыльскай трагедыі ў сваіх творах. Напрыклад, вядомая ўсім «Чарнобыльская малітва» С. Алексіевіч, якой натхняліся стваральнікі серыяла «Чарнобыль», або «Апакаліпсіс па графіку» А. Адамовіча, «Злая зорка» І. Шамякіна, «Выратуй і памілуй нас чорны бусел» В. Казько. Таксама вядомымі ва ўсім свеце творамі пра Чарнобыль з'яўляюцца



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«Чарнобыльскі сшытак» Р. Мядзведзева, «Спадчына Чарнобыля» Ж. Алфёрава, дакументальная аповесць украінскага вучонага Ю. Шчарбака «Чарнобыль».

«Першы буйны твор у жанры антыўтопіі, які асэнсаваў пасля Чарнобыля ядзерную катастрофу, – аповесць А. Адамовіча “Апошняя пастараль” – па сутнасці аказалася накіраванай да далёкіх продкаў, хаця адрасавалася сучаснікам, – адзначае І. М. Афанасьеў у кнізе “Чарнобыльскае светаадчуванне…”. – А між тым, Адамовіч паставіў перад сабой вельмі відавочную, “зямную” не утапічную задачу: расказаць аб тым, што чалавецтва згубіць, чаго сябе пазбавіць, калі…» [1, с. 11].

І беларусы ўжо згубілі, прайшлі першы круг чарнобыльскага пекла. Цяжка сказаць, колькі мы яшчэ будзем пакутаваць ад наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. Але гэтая падзея значна адбілася на жыцці ўсёй беларускай нацыі. Многія пісьменнікі асэнсоўваюць гэтую трагедыю ў сваіх творах, у тым ліку і Ю. Станкевіч у апавяданні «Уначы гучней бруяць фантаны». Сюжэт у дадзеным творы вельмі просты, жыццёвы. Пачынаецца ўсё з таго, што маладому фалькларысту Пятру Вашкевічу тэлефануе невядомы, які прадстаўляецца яго анёлам-ахоўнікам і просіць героя твора збірацца, каб паспець на ранішні цягнік. Бо бяда над ім навісла, трэба ратавацца. Пётра вырашае не звяртаць увагі на словы жартаўніка. А наступнай раніцай, калі ён ехаў на ровары, паўз яго пранеслася 20 пажарных машын. Праз суткі Вашкевічу ўжо ўручылі позву на зборы, а пасля ён дапамагаў эвакуяваць насельніцтва: «Аўтобусы падагналі проста да пад’ездаў: старых выводзілі з дамоў пад рукі, дзяцей выносілі. Ніхто толкам нічога не ведаў і ніхто нават не супраціўляўся, вось што было дзіўна. Ірэальнасць таго, што адбывалася, успрымалася ім тут праз нейкі час як норма. Чалавек да ўсяго прывыкае» [2, с. 341].

Што адбылося, чытач зразумее яшчэ на моманце з пажарнымі машынамі, але адкрытым застанецца пытанне пра анёла-ахоўніка, які быццам бы сапраўды ведаў будучыню. Пакуль што звернем увагу на іншае: «Людзей перасялялі яшчэ некалькі дзён, але гэтага Пётра ўжо не бачыў, бо працаваў у самай апраметнай – яны пракладвалі тунэль пад рэактарам, каб потым запампоўваць туды бетон» [2, с. 341]. То бок наш герой яшчэ вельмі доўга працаваў у непасрэднай блізкасці ад самога рэактара, а значыць, і небяспечную дозу радыяцыі мог атрымаць менавіта ў той час.

У наступнай частцы апавядання Ю. Станкевіч апісвае сустрэчу ўжо знаёмага нам Пётры з былым калегам па інстытуце Міхасём Скакуном. Мінула шэсць год з падзей той ночы, калі адбыўся выбух на чацвёртым рэактары АЭС. І знешні выгляд Вашкевіча, якога Міхась помніць як выдатнага спартсмена, што прэтэндаваў на месца ў вышэйшай лізе, сапраўды шакуе: «Пётру везлі па калідоры ў калясцы. Ён быў зусім лысы, нават без броваў і веек. Міхась спачатку не пазнаў яго, але нечакана ўбачыў прывітальна ўзнятую руку. Адна нага ў Пётры была загіпсаваная, твар, і так рэзкі, птушыны, стаў яшчэ больш стончаны і худы і набыў ненатуральна бледны колер» [2, с. 342].

Відавочна, што такі знешні выгляд – гэта наступствы той самай аварыі і яшчэ таго, што Пётра быў сярод людзей, якія дапамагалі эвакуяваць насельніцтва. Усяго шэсць год, а такія кардынальныя змены. У героя апавядання нават косці сталі крохкімі і ўжо не зрастаюцца. Ю. Станкевіч паказвае, наколькі сур’ёзныя наступствы Чарнобыльскай катастрофы для галоўнага героя, і хоць аўтар не канкрэтызуе ўзрост Пётры Вашкевіча, але на пачатку твора складваецца ўражанне, што ён даволі малады. Пазней Міхась яшчэ заўважае, што былы сябра ўжо не мае некалькіх зубоў. Потым успамінае падзеі шасцігадовай даўнасці, калі да яго на працу завітала Насця, былая каханка Вашкевіча. Тут і высвятляецца, па якой прычыне анёл-ахоўнік, які на самай справе і ёсць Міхась Скакун, тэлефанаваў тады Пётру. Дзяржаўнае кіраўніцтва вельмі напружвала фальклорная дзейнасць Вашкевіча, таму яно распачало працу па падрыхтоўцы арышту небяспечнага элемента, то бок Пётры Вашкевіча. А Насця прыехала, каб яго папярэдзіць і выратаваць такім чынам ад арышту праз пасрэдніцтва Скакуна: «Насця павагалася,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рэзкім рухам патушыла цыгарэту і сказала: – Табе можна верыць. Дык вось яму, дурненькаму, справу хочуць наматаць. Быццам ад таго, чым ён там займаецца, існуе пагроза нацыяналізму» [2, с. 348]. Але аварыя ў Чарнобылі ўнесла свае карэктывы ў планы вышэйшага кіраўніцтва, таму Вашкевіча пакінулі ў спакоі.

Вядома, на некаторы час чытач задумваецца, а калі б Пётра даверыўся гэтаму анёлу і з'ехаў? Як тады склалася б яго жыццё? Няўжо Міхась Скакун мог сапраўды выратаваць свайго былога сябра ад таго лёсу, які ён напаткаў?

У апавяданні Ю. Станкевіч выразна паказаў, як трагедыя ў Чарнобылі зламала жыццё аднаго чалавека. Пётра Вашкевіч, які мог зрабіць кар'еру выдатнага спартсмена, ужо праз 6 год пасля аварыі літаральна памірае, і выратаваць яго немагчыма.

Яшчэ адным творам, дзе Ю. Станкевіч, хоць і ўскосна, але ўзгадвае Чарнобыльскую аварыю, з'яўляецца раман «Любіць ноч – права пацукоў». У гэтым творы гаворыцца аб тым, што Юльян, сын галоўнай гераіні Любы «<…> быў зачаты там, дзе дазіметры паказвалі больш як пятнаццаць кюры» [3]. У выніку хлопчык нарадзіўся з хваробай Даўна. То бок, калі ў першым апавяданні Ю. Станкевіч звяртаў увагу толькі на фізічны стан і здароўе і як яно пагаршаецца ў галоўнага героя, то ў гэтым рамане высокі радыёактыўны фон стаў прычынай запавольвання псіхічнага развіцця дзіцяці. Менавіта з-за яго хваробы суседскія дзеці пачалі жорстка з яго здзекавацца. У творы выразна паказваецца, што без догляду блізкіх ён не здольны выжыць. Хлопчык разумеў, калі да яго звярталася маці ці дзядзька, але сам поўнымі сказамі не размаўляў. Сябе ён называў Уля, а калі гуляўся з трусам, якога звалі Піліп, то прыгаворваў «ПіляПіляПіля» [3]. Мог папрасіць есці, гаворачы «кашыкашыкашы», а калі маці ўзгадвала Данілу, яго дзядзьку, то Уля зноў пачынаў радасна паўтараць «ДаняДаняДаня». Праз тое, як хлопчык гутарыць з маці, а потым і са сваім дзядзькам, Ю. Станкевіч выдатна перадае яго характар і паказвае, як хвароба адбілася на яго развіцці. Ён зусім не прыстасаваны да жыцця ў соцыуме, дзе патрэбна ўсё рабіць самастойна, і галоўная перашкода для гэтага менавіта яго хвароба, а не яго малы ўзрост. З твора не вынікае, ці зможа Юльян нармальна жыць, яго далейшы лёс застаецца для нас невядомым.

Цікавым у сюжэтным плане з'яўляецца і твор І. Пташнікава «Львы», які быў напісаны ўсяго праз год пасля катастофы, у 1987 г. У гэтым апавяданні падзеі пасля Чарнобыльскай аварыі паказаны вачыма сабакі па мянушцы Джукі. Калі два тыдні таму яго пачало блажыць, ён сарваўся з прывязі, ад сухога кашлю яго ратавала толькі адна лекавая расліна, ад якой яму лепшала і ён вяртаўся на свой двор, спадзеючыся знайсці маладога гаспадара. На жаль, нікога з людзей дома не было: «На двары было пуста, дзверы ў хату і ў хлеў былі пазачыняны. У хляве, чуваць было, грукала рагамі аб сцяну карова і рохкалі свінні. Куры, выдзеўбаўшы гразь у карыце, паселі на ганку і круцілі галовамі. У хаце крычала на ўсё горла радыё – не выключылі» [4].

Сабака ўжо які дзень спадзяваўся сустрэць свайго гаспадара, які чамусьці ўсё яшчэ ніяк не вяртаўся дамоў: «Джукі, прыбегшы з логу, як і ўчора раніцай, шукаў маладога гаспадара: станавіўся на заднія лапы і пярэднімі дзёр па дзвярах у хату, пішчаў і скуголіў. Ніхто не адчыняў» [4].

Відавочна, што ў гэтым творы аўтар паказвае нам трагедыю Джукі, які застаўся адзін, без гаспадароў, у зоне з павышанай радыяцыяй. З усіх сабак, што жылі навокал, толькі ён у канцы застаецца жывы. Цяпер ён будзе вымушаны бадзяцца па зоне да тых часоў, пакуль смерць у рэшце рэшт, не прыйдзе па яго. Ускосна І. Пташнікаў паказвае і пачуцці гаспадара Джукі, які вымушаны пакінуць свайго любімага гадаванца назаўсёды. Сабака ўспамінае той дзень, калі гаспадар з сям'ёй з'ехаў на аўтобусе: «Джукі, цягнуў і цягнуў носам пыл: не ля школы, дык ля магазіна гаспадар будзе – мала, што ён у тую раніцу сеў з маладой гаспадыняй – у яе на руках было двое малых, а ён валок два вялікія чамаданы – у біткам набіты аўтобус. Перад тым гаспадар пусціў яго ў хату і доўга гладзіў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

па галаве, гледзячы ў вочы. Пасля сам лізнуў яго, Джукі, у нос і заплакаў» [4]. Калі аўтобус пачаў свой рух, Джукі бег за ім аж да Стралічава, не дабегшы да Хойнік.

У творы выразна паказана, як паступова памірае жыццё ў вёсцы пасля таго, як людзі пакінулі яе, да таго ж ніякіх рэчаў яны з сабой узяць не маглі, як і забраць сваіх жывёл. Па сутнасці, яны вымушаны былі пакінуць іх паміраць з голаду ў адзіноце, бо ніхто болей не прыйдзе іх даглядаць.

А колькі трагічных гісторый, падобных да тых, што прадстаўлены ў прааналізаваных вышэй творах Ю. Станкевіча і І. Пташнікава, было па ўсёй Беларусі? Колькі зламаных жыццяў? Колькі нешчаслівых людзей? Або занадта рана памерлых? Колькі пакінутых у адзіноце? Менавіта на гэтым акцэнтуюць увагу ў сваіх творах аўтары, заклікаючы чытачоў не забываць пра Чарнобыльскую трагедыю, якая для беларусаў стала агульнанацыянальнай.

**Літаратура**


1 Афанасьеў, І. М. Чарнобыльскае светаадчуванне ў сучаснай беларускай літаратуры. Вып. 1: Бягучы літ. працэс у крыт. аглядзе. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – 206 с.

2 Станкевіч, Ю. Паўночны вецер для спелых пладоў : раман, аповесці, апавяданні / Юры Станкевіч. – Мінск : Галіяфы, 2015. – 354 с.

3 Станкевіч, Ю. Любіць ноч – права пацукоў [Электронны рэсурс] / Юры Станкевіч // Беларуская палічка. – Рэжым доступу : https://knihi.com/Jury_Stankievic/Lubic_noc -prava_pacukou.html. – Дата доступу : 13.04.2021.

4 Пташнікаў, І. Львы [Электронны рэсурс] / Іван Пташнікаў // Беларуская палічка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Ivan_Ptasnikau/Lvy.html. – Дата доступу : 21.04.2021.



**УДК 821.161.3-14*У. Дубоўка**



***Г. У. Таргонская***


## ПРАЦЭСЫ ПЕРЦЭПТУАЛІЗАЦЫІ Ў ЛІРЫЦЫ У. ДУБОЎКІ І ІХ МАСТАЦКАЯ ФУНКЦЫЯ


*У артыкуле на прыкладзе лірыкі У. Дубоўкі разглядаюцца адметнасці паэтычнага ўвасаблення працэсаў перцэптуалізацыі. У сваіх вершах паэт карыстаецца зрокавым, слыхавым і дотыкавым модусамі перцэпцыі, якія на падсвядомым узроўні ўздзейнічаюць на чытача, які пачынае суперажываць лірычнаму герою. Сфера пачуццяў у вершах раскрываецца з дапамогай каларыстыкі: кожнае адценне мае сваю сімволіку і асацыятыўнасць, слыхавы модус надае вобразам кінематаграфічнасць.*


Мастацкі твор уяўляе сабой індывідуальную інтэрпрэтацыю рэчаіснасці аўтарам як вынік пазнання. Крыніцай любога кагнітыўнага працэсу прынята лічыць эмацыйна-пачуццёвыя адчуванні і ўражанні, якія пасля падлягаюць моўнай апрацоўцы ў адпаведнасці з канцэптуальнымі ўстаноўкамі свядомасці аўтара. Галоўным «інструментам» адлюстравання мадэлі вобраза свету ў творы выступае працэс перцэптуалізацыі, выяўлены праз зрок, слых, дотык, нюх (модусы перцэпцыі).

Уладзімір Дубоўка з’яўляецца адным з нешматлікіх беларускіх пісьменнікаў-эстэтаў савецкага часу, якім удалося раскрыць сферу пачуццяў і рэфлексіі ў літаратурным тэксце. Ён ставарае ў сваіх вершах вобразы прыроды такім чынам, каб чытач уявіў сабе карціну свету праз прызму ўспрыняцця навакольнага асяроддзя аўтарам.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ